

Кроў для пацярпелых людзі здавалі па ўсёй Беларусі.

Фота БЕЛТА.

г. Брэст.

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 КРАСАВІКА 2011 г. СЕРАДА

№ 68 (26932)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ДАПАМАЖЫЦЕ КОЖНАМУ, НІКОГА НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ...»

**ПРЭЗІДЭНТ Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў аказаць усю неабходную дапамогу пацярпелым і сем'ям загінулых пры выбуху на станцыі метро «Кастрычніцкая» ў Мінску. Адпаведную задачу кіраўнік дзяржавы паставіў на экстраннай нарадзе 11 красавіка, паведамілі БЕЛТА ў прэсслужбе беларускага лідара.**

Адразу ж пасля выбуху сітуацыя была даложана Прэзідэнту. Кіраўнік дзяржавы неадкладна прыбыў на станцыю метро «Кастрычніцкая», спусціўся на платформу і разам з сынам усклаў кветкі да месца выбуху. Гэта былі першыя кветкі ў памяць аб ахвярах тэракта.

Затым кіраўнік дзяржавы агледзеў варонку, разбураныя канструкцыі станцыі, пашкоджаны састаў, праверыў, як ідзе работа па ліквідацыі наступстваў выбуху.

Вярнуўшыся з месца здарэння, Прэзідэнт правёў экстранную нараду. Сілавікам, ураду, Адміністрацыі Прэзідэнта, Мінгарвыканкаму дадзены канкрэтныя даручэнні па дапамозе пацярпелым, узмацненні мер бяспекі на транспарце, у месцах масавага скопішча людзей і расследаванні злачынства.

Прэзідэнт Расіі пазваніў кіраўніку беларускай дзяржавы і выказаў самыя глыбокія спачуванні. Дзмітрый Мядзведзеў прапанаваў аказаць Беларусі любую неабходную дапамогу (як у частцы вядзення следства, так і аказання медыцынскай дапамогі пацярпелым).

Ужо 12 красавіка ў Беларусь прыбыла група супрацоўнікаў Федэральнай службы бяспекі, якія спецыялізуюцца на раскрыцці такіх злачынстваў. Аднačасова Дзмітрый Мядзведзеў прапанаваў накіраваць у Мінск брыгаду ўрачоў, якія маюць вопыт лячэння падобных траўм.

У пачатку нарады ўсе прысутныя ўшанавалі памяць загінулых мінутай маўчання.

Прэзідэнт Беларусі запатрабаваў ад сілавога блока штодзённых вынікаў у расследаванні выбуху. «Вынікі павінны быць кожны дзень. Працуйце дзень і ноч», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў генеральнаму пракурору неадкладна стварыць следчую групу, узмацніць яе супрацоўнікамі пракуратуры, МУС, КДБ. Кіраўніком групы назначаны намеснік генпракурора Андрэй Швед.

«У самыя кароткія тэрміны ўсё да самых дробных падрабязнасцяў і дэталяў улічыць, расследаваць, усё высветліць. Вінаватыя павінны быць знойдзены», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Вынікі павінны быць кожны дзень з нарастаючым падрахункам», — запатрабаваў ён.

Прэзідэнт не выключыў сувязі цяперашняга выбуху ў метро з падзеямі 3 ліпеня 2008, даручыўшы старшыні КДБ Вадзіму Зайцаву праналізаваць факты і паглядзець на магчымасць наяўнасці сувязі. «Можа, гэта звёны аднаго ланцужка. Устанавіце, каму выгадна ўзарваць спакой і стабільнасць у краіне, хто за гэтым стаіць», — сказаў Прэзідэнт.

«Я хачу, каб вы запомнілі — вы несяце асабістую адказнасць за расследаванне гэтай крымінальнай справы», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да старшыні КДБ.

Аляксандр Лукашэнка даручыў дзяржсакратару Савета Бяспекі і кіраўніку МУС максімальна ўзмацніць меры бяспекі. «Дзейнічайце рашуча. Думаю, людзі нас зразумеюць. Усе падраздзяленні ў МУС павінны быць пастаўлены пад ружжо. Вывернуць усё навыварат! Асабліва на наяўнасць незарэгістраванай зброі, узрыўчаткі, боепрыпасаў», — запатрабаваў Прэзідэнт.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы паставіў задачу перад міністрам абароны неадкладна правесці праверку ўсіх складоў на наяўнасць боепрыпасаў, узрыўчаткі, ці ўсё знаходзіцца на месцы і ці ўсюды належным чынам забяспечваецца ахова.

«Не выключаю, што нам могуць гэты «падарунак» завезці з-за мяжы, але нам трэба паглядзець у сябе. Гэта важна», — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы, што чакае аб гэтым даклада асабіста міністра абароны.

«Звяжыцеся са сваімі расійскімі калегамі па лініі ФСБ, КДБ і пракуратуры, скажыце, якая вам патрэбна дапамога», — звярнуўся Прэзідэнт да прысутных.

Як адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы, «спецыялістаў з Расіі неабходна прыцягнуць хоць бы для ацэнкі сітуацыі». Паводле яго слоў, яны ўжо гатовы выехаць.

Як было даложана на нарадзе, сваю дапамогу Беларусі ў расследаванні тэракта прапанавалі таксама Вялікабрытанія і Ізраіль.

Акрамя таго, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, ён дамовіўся са сваім расійскім калегам, што неадкладна будуць накіраваны спецыялісты з Расіі, якія пракансультуюць беларускіх урачоў, падкажуць, як лячыць пацярпелых у выніку выбуху, якія акрамя фізічных траўмаў атрымалі моцны псіхалагічны зрыў. «Таму не адмаўляйцеся ад дапамогі. Звяжыцеся цяпер жа з міністрам аховы здароўя Расіі, яна чакае вашага званка, і дамоўцеся», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да міністра аховы здароўя Беларусі Васіля Жарко. «Яшчэ раз падкрэсліваю: у выніку выбуху загінулі людзі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка даручыў аказаць усю неабходную дапамогу пацярпелым, у тым ліку матэрыяльную. «Вылечыць, паставіць раненых на ногі! Не шкадуйце нічога, тым больш у нас для гэтага ўсё ёсць», — падкрэсліў ён.

Звяртаючыся да ўрада, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Дапамажыце кожнаму, нікога не забудзьце. Усіх без усялякіх затрымак падтрымайце — каму трэба аказаць фінансавую дапамогу, пацярпелым, сем'ям загінулых, пахаваць людзей. Разам з кіраўніком спраў Прэзідэнта неадкладна падключыцеся да гэтай работы, калі трэба, сустрэньцеся з сем'ямі».

Прэзідэнт таксама даручыў старшыні Мінскага гарвыканкама Мікалаю Ладуцьку прафінансаваць усе расходы, якія неабходна правесці тэрмінова, з бюджэту горада.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на такі немалаважны факт, як аператыўнае інфармаванне насельніцтва аб ходзе расследавання. «Усе спісы пацярпелых, хто, дзе знаходзіцца на лячэнні, неадкладна апублікуйце і адразу паведамляйце людзям усё, што толькі магчыма», — даручыў кіраўнік дзяржавы.

Даручэнне інфармаваць аб усім насельніцтва Аляксандр Лукашэнка даў і кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзіміру Макею. «Людзям трэба даць поўную інфармацыю. Усё, што журналісты будуць пытаць, арганізуйце адказы на ўсе пытанні. Не трэба нічога ўтойваць, людзі павінны ўсё ведаць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама даручыў у самы кароткі тэрмін аднавіць рух у метро.

Звяртаючыся да старшыні Мінгарвыканкама, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што жыццё горада не павінна быць паралізавана. «Тое, што вы хутка разабраліся на зямлі, за гэта дзякуй. Але і заўтра, і паслязаўтра ніякай затрымкі з дастаўкай людзей па лініі метро быць не павінна», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы даручыў выдзеліць неабходную колькасць аўтобусаў для перавозкі людзей па маршруце першай лініі метро.

«За самы кароткі тэрмін рух у метро трэба аднавіць», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Я разумею, што гэта перш за ўсё звязана з работай следчай групы. Але ёсць і іншыя пытанні. Таму трэба, каб ужо сёння стаялі напагатове брыгады рамонтнікаў, якія ачысцяць станцыю. Як толькі будзе магчыма, пракурор дасць адпаведную адмашку — аднавіце рух», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, людзі атрымалі траўмы і ад падвясных столевых элементаў станцыі, якія пасыпаліся зверху. «Тое, што там хлам цяпер пасля выбуху, гэта вам навука. Метро трэба аздабляць так, каб на галаву нічога не падала. Не толькі ад выбуху, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Добра, гэта да нас было, але мы таксама ўжо працуем нямала, даўно на гэта трэба было звярнуць увагу. Там траўмы людзі атрымалі яшчэ і ад таго, што пасыпалася на галаву са столі».

«Наогул, звярніце сур'ёзную ўвагу на работу метрапалітэна. Гэта ў любой дзяржаве слабае месца», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка даручыў аб'явіць у Мінску дзень жалобы і вызначыць канкрэтную дату. «У знак павагі да людзей гэта трэба зрабіць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт лічыць, што выбухам у сталічным метро кінуты сур'ёзны выклік, які патрабуе адэкватнага адказу. «Нам кінуты сур'ёзны выклік, і, трэба прызнаць, вельмі сур'ёзны. І патрэбны адэкватны адказ, ён павінен быць знойдзены», — сказаў Прэзідэнт.

«Спакойнага жыцця нам не дадуць. Я вас аб гэтым папярэджваў. Хто яны? І з адказам на гэта пытанне не прашу пасляшацца», — сказаў кіраўнік дзяржавы прысутным.

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся таксама да насельніцтва з просьбай дапамагчы ў расследаванні выбуху ў Мінскім метрапалітэне. «Хацеў бы звярнуцца да людзей сумленна і адкрыта: без вас нам цяжка будзе знайсці гэтых нелюдзяў. Вы павінны нам дапамагчы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Крыць няма чым. У гэтым здарэнні вінаваты толькі мы. Мы не забяспечылі, як гэта было заўсёды, спакой, няхай нават у канкрэтным месцы нашай сталіцы. Віна ляжыць на нас. І мы павінны зрабіць усё, каб людзі не падумалі, што мы дарма ядзім дзяржаўны хлеб», — адзначыў Прэзідэнт.

СТАР. 2

## «БАЛЮЧА... ПРЫКРА... СТРАШНА...

### ЧОРНЫ СЛЕД

*Светлай памяці ахвяр тэракта ў мінскім метро 11 красавіка 2011 года*

Скалануў страшэнны
выбух горад,
Сее смерць
бандыцкая рука.
І цячэ рака
людскога гора —
Скрушная, жалобная рака.

Хто, адкуль ты,
вылюдак-пачвара?
Свой, чужынец?
Ты не зменіш свет!
За якой бы ні схаваўся
хмарай, —
Знойдзем, нелюдзь,
твой звярыны след!

Кінь спадзеў —
не станем на калені!
Не зламаць нас,
не перамагчы!
Будзем з пакалення
ў пакаленне
Бацькаўшчыну нашу
берагчы!

Будзем помніць
кожную ахвяру.
Гартаваць свой
нескароны дух.
Здзейснім нашы планы,
нашы мары!

...Я пра гэта
светлы верш складу.

**Іван КАРЭНДА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## АЛЕ ГЭТАЯ БЯДА ПАВІННА ЗГУРТАВАЦЬ НАШ НАРОД»

**Аляксандр Анатольевіч БАРЭЙКА, пенсіянер, вёска Брольнікі Навагрудскага раёна:**

— Я якраз гляджу па тэлебачанні навіны... Мне добра знаёмая сталічная шостая бальніца, дзе зараз знаходзяцца пацярпелыя. Мне там двойчы рабілі аперацыю на тазасцегнавым суставе, я інвалід, дрэнна хаджу... Тое, што адбылося, — гэта вялікая бяда для нашага народа. Утварыць гэта маглі толькі тыя, хто мае нянавісць да народа.

**Аляксандр Уладзіміравіч АБРАМОВІЧ, кіроўца аддзялення «Белаграпрамбанка» ў г. Нясвіжы:**

— Што тут можна сказаць... Гэта вельмі сумна, горка, страшна... Самая сапраўдная правакацыя, інакш і назваць нельга тое, да чаго дадумаліся гэтыя... Я слухаю радыё, чую, што кажуць наконт падзей людзі. Упэўнены: рэакцыя, улічваючы наш менталітэт, павінна быць зусім іншай, супрацьлеглай яму. Пакаранне павінна быць жорсткім! І стаўленне людзей да падзей павінна быць адпаведным. Гэтая трагедыя павінна прымусіць людзей сабрацца, паводзіць сябе так, каб тыя, хто ўсё гэта задумваў, не атрымалі жаданага плёну. Мы не павінны дапусціць дэстабілізацыі, гэты фактар, наадварот, павінен згуртаваць народ.

**Алена Юр'еўна ІВАНЧЫК, начальнік аддзела эканомікі ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Шчучынскага райвыканкама:**

— Няма слоў... Балюча, прыкра, страшна... На шчасце, з маіх родных ніхто не пацярпеў. Лічу, што вінаватыя павінны панесці самае суровае пакаранне. Іншых варыянтаў тут папросту няма. За тое ўчыненае, інакш і не назавеш, зверства...

**Анатоль Аляксеевіч МАЛЬКО, начальнік Мядзельскага раённага вузла электрасувязі:**

— Гэта зрабілі нелюдзі, інакш і не назавеш. Рэспубліка Беларусь была самай стабільнай і на абсягах СССР, і потым СНД. А тут такое ўтварылася... Таму трэба зрабіць усё, каб гэтае злачынства было раскрытае і тыя нелюдзі па максімуме атрымалі за зробленае... Усе мы людзі, у кожнага ёсць блізкія, знаёмыя, у тым ліку ў Мінску. У мяне сын у сталіцы вучыцца, пляменнікі. Натуральна, кінуліся высвятляць, што з імі. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Таму яшчэ раз паўтару: у гэтых нелюдзяў няма нічога чалавечага, трэба зрабіць усё магчымае, каб знайсці іх і пакараць.

**Тамара Мікалаеўна ГАРКАВЕНКА, пенсіянерка, г. Мінск:**

— Што я магу сказаць? Я ненавіджу гэтых людзей. Іх трэба адшукаць і прынародна пакараць смерцю...

**Ігар Уладзіміравіч АДАМОВІЧ, журналіст газеты «Раённы веснік», г.Чэрвень:**

— Гэта жах... У спісе пацярпелых быў ураджэнец нашага горада. Са згоды і пры дапамозе яго брата я зараз рыхтую матэрыял. Пацярпелы атрымаў цяжкае раненне, страціў шмат крыві, зараз знаходзіцца ў шпіталі. Ён ехаў з сябрам. Ураджэнец нашага горада выйшаў з вагона першым, і тут адразу — выбух. А сябар не паспеў ступіць на платформу, застаўся ў вагоне, і яго нават не зачапіла. Ён толькі ўбачыў, што наш чэрвеньскі хлопец ляжаць у крыві. Сябар выцягнуў яго з метро на паверхню і разам з ім на «хуткай» паехаў у шпіталь.

**Аляксандр Браніслававіч ЛАСІЦКІ, старшыня Пліскага сельскага Савета Смалявіцкага раёна:**

— Гэта чысцюткай вады абсурд, карані якога ідуць ад 19 снежня. Вы ж ведаеце, беларускі народ тут абсалютна не прычым. Мы мірныя людзі, імкнёмся сябраваць з усімі, гэта наша палітыка. Але ж знайшліся тыя, хто, магчыма, і за грошы... У нас тут толькі пра гэта і размовы. І меркаванне агульнае: трэба абавязкова знайсці вінаватых і пакараць па поўнай праграме. Без адвакатаў. Толькі жорсткія меры! Колькі жыву, упершыню сутыкаюся з такім. Які прыклад мы дадзім дзецям, нашчадкам? Толькі скончыліся выбары, жыццё пайшло далей, а тут нехта піхае палку ў колы нашай беларускай машыны.

**Ніна Уладзіміраўна ПАТОЦКАЯ, начальнік аддзела адукацыі Старадарожскага райвыканкама:**

— На шчасце, бяда абышла дарагіх мне людзей бокам... Пачуцці перапаўняюць, настрой вы здагадваецеся які... Як тут выказацца? Як сказала б любая маці... Што пацярпелі нявінныя дзеці, моладзь, студэнты. Бацькі адпраўлялі іх у вялікі горад вучыцца, а тут такое... Такое не павінна паўтарыцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Андрэй ШВЕД:

## «МЭТА АДНА — У НАЙБОЛЬШ КАРОТКІЯ ТЭРМІНЫ ЗНАЙСЦІ ГЭТАГА ПАДОНКА АБО ГРУПУ АСОБ І ПАКАРАЦЬ У АДПАВЕДНАСЦІ З БЕЛАРУСКІМ ЗАКОНАМ»

**НАМЕСНІК генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Андрэй ШВЕД правёў учора прэсканферэнцыю, дзе расказаў журналістам самыя апошнія звесткі (па стане на 12 гадзін дня) аб выбуху на станцыі метро «Кастрычніцкая»:**

— Зараз следчай групай праведзены агляд месца здарэння, ёсць сотні рэчавых доказаў, мы з імі працуем. Акрамя таго, мы завяршаем агляд пашкоджанага саставу электрацягніка. З раніцы пачалася і па цяперашні час праводзіцца судова-медыцынская экспертыза целаў загінулых. На гэты момант загінула 12 чалавек: 11 загінулі непасрэдна на месцы, адзін, на жаль, сканаў у бальніцы падчас аказання медыцынскай дапамогі. Пакуль з 12 загінулых з большай доляй верагоднасці ўстаноўлены асобы дзесяці. Па двух астатніх, на жаль, пакуль я не магу афіцыйна пацвердзіць іх асобы, праца ў гэтым напрамку вядзецца.

Андрэй Швед паведаміў, што Беларусь зацікаўлена ў тым, каб любыя арганізацыі, любыя асобы, любыя дзяржавы аказалі рэальную практычную дапамогу, а таксама адзначыў, што ўжо з раніцы працуюць спецыялісты ФСБ Расіі, выбухатэхнікі, а 13 красавіка павінны прыбыць следчыя са следчага камітэта Расіі, якія маюць вопыт расследавання крымінальных спраў, звязаных з тэрарызмам. «Будзем абменьвацца вопытам падчас расследавання гэтай крымінальнай справы», — сказаў ён.

— Калі спецыялісты іншых дзяржаў гатовы аказаць садзейнічанне, то мы будзем гэта толькі вітаць, — сказаў намеснік генпракурора. — Мэта адна — у найбольш кароткія тэрміны знайсці гэтага падонка або групу асоб і пакараць у адпаведнасці з беларускім законам. Я мяркую, што меры павінны быць да такіх людзей адэкватнымі, безумоўна, у рамках закона, але адэкватнымі.

Што тычыцца версій, то на гэтае пытанне Андрэй Іванавіч не адказаў, спаслаўшыся на тое, што больш падрабязная інфармацыя будзе агучана пазней:

— Мэта зразумелая — дэстабілізацыя грамадскага становішча ў нашай краіне. Ніякіх гучных заяў рабіць не буду, але разам з тым трэба набрацца цярпення — у вельмі кароткія тэрміны мы давядзём да грамадскасці важную інфармацыю па гэтай справе. І ёсць пэўныя ўстаноўленыя намі прыкметы злачынца. Ужо адпрацоўваюцца некалькі асоб. Гэтыя прыкметы вельмі канкрэтныя, вельмі зразумелыя, і па гэтых прыкметах мы будзем працаваць, — сказаў Андрэй Швед, але не ўдакладніў, ці ёсць затрыманыя. — Скажу так: ёсць канкрэтныя асобы, у дачыненні да якіх мы праводзім канкрэтную працу.

СТАР. 2

## БУДЗЕМ ПОМНІЦЬ

*Устаноўлены асобы васьмі загінулых у мінскім метро*

**Ахвярамі выбуху сталі: Абражэй Наталля Валянцінаўна (дата нараджэння — 0.6.11.1966), Шагойка Ганна Віктараўна (09.10.1954), Капцюх Раман Васільевіч (16.03.1990), Сярбаеў Сяргей Уладзіміравіч (04.11.1988), Наркевіч Анатоль Уладзіміравіч (03.06.1959), Парфунцаў Аляксандр Яўгеньевіч (21.03.1954), Клемец Юрый Аляксандравіч, 1987 года нараджэння, Захаркова Таццяна Ігараўна (20.11.1968).**

Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам адкрыты дабрачынны рахунак для залічэння ахвяраванняў у сувязі з трагічнымі падзеямі, што адбыліся на станцыі метро «Кастрычніцкая».

**Рахунак № 3642740104035 у аддзяленні 539 ААТ «Белінвестбанк» код 739.**

Вадзім ЗАЙЦАЎ:

## «ВЫКЛІК КІНУТЫ ЎСЯМУ БЕЛАРУСКАМУ ГРАМАДСТВУ»

**КАМІТЭТ дзяржаўнай бяспекі Беларусі ў цесным узаемадзеянні з Генеральнай пракуратурай і Міністэрствам унутраных спраў прыступіў да расследавання тэрарыстычнага акта на станцыі метро «Кастрычніцкая». Рабоце аператыўна-следчай групы аказваюць садзейнічанне спецыялісты-выбухатэхнікі ФСБ Расіі. Расійскія эксперты прыбылі ў Мінск учора па прапанове кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі.**

— Супрацоўнікі органаў дзяржаўнай бяспекі пераведзены на ўзмоцнены рэжым работы, — паведаміў учора журналістам **старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі Вадзім ЗАЙЦАЎ**. — Пярвічныя вынікі следчых і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў былі атрыманы па гарачых слядах. Праваахоўнікі робяць усё неабходнае для хутчэйшага расследавання і прыцягнення да адказнасці тых, хто дапусціў і здзейсніў гэта злачынства. Намі атрыманы рэчыўныя доказы... З прапановамі аб прадастаўленні дапамогі звярнуліся прадстаўнікі некалькіх дзяржаў. Мы не будзем адмаўляцца ад такой дапамогі, паколькі тэракт не ведае межаў і, на жаль, дае той вопыт, які атрымліваюць спецслужбы ў барацьбе з гэтым злом...

Адпрацоўваюцца тры версіі ўчыненага злачынства. Паводле першай, мелася на мэце дэстабілізаваць сітуацыю ў Беларусі. Я не хачу падкрэсліваць, хто стаіць за арганізацыяй гэтай дэстабілізацыі, але відавочна тое, што сёння некаму не падабаецца існуючая мадэль беларускага грамадства, беларускай структуры бяспекі, і таму ёсць намер пасеяць страх, паніку і недавер да праваахоўных органаў, а значыць, і да органаў улады.

Паводле другой версіі, варта мець на ўвазе той факт, што не ўсе прыцягнутыя да адказнасці асобы або асобы, чые справы яшчэ разглядаюцца, згодныя з рашэннем судовых органаў. Ёсць у нас прадстаўнікі крайніх моладзевых экстрэмісцкіх арганізацый.

СТАР. 3

**Транспартная філасофія**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ПАСЛЯ ТЭРАКТА ЖЫЦЦЁ НЕ ЗАКАНЧВАЕЦЦА

11 — Нью-Ёрк, Японія, Мінск. Паміж датамі і падзеямі шукаюць сувязь. Я лічу гэта звычайнай выпадковасцю ці здзеклівай насмешкай злачынцы: верыце ў цуды — атрымайце!

11 красавіка. Раніцай я праніклёна расказвала па радыё, што сёння мы адзначаем дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў, які гэта подзвіг — знявечаным, знясіленым, жывым напалову людзям здзейсніць паўстанне ў Бухенвальдзе, захапіць лагер у свае рукі і пратрымацца, пакуль не прыйдзе дапамога. Я радавалася і ганарылася імі праз 66 гадоў.

Каля шасці вечара ў Мінску настала іншае жыццё. Выбух у метро здаваўся злосным жартам ці неверагоднай гіпербалай — у нас гэтага не можа здарыцца. Думаю, кожны беларус у той вечар не адыходзіў ад тэлевізара і камп'ютара. Да позняй ночы я маніторыла сітуацыю ў інтэрнэце, вывярала спісы пацярпелых, дазвоньвалася да блізкіх. Ніхто з іх не пацярпеў — мне пашанцавала. А нехта ж у той вечар не дачакаўся дадому маці, бацьку, сына, брата... Нехта паехаў на працу і не вярнуўся.

Панядзелак, першы працоўны дзень пасля выхадных, цяжкі дзень. І ён падыходзіў да завяршэння. Людзі ехалі з працы. Нарэшце ехалі з працы. Лепш бы затрымаліся.

СТАР. 2




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.04.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 055,00 | 1 чэшская крона | 180,54 |
| ▲ 1 еўра | 4 408,67 | 1 польскі злоты | 1 109,74 |
| 1 латвійскі лат | 6 218,20 | ▼ 1 расійскі рубель | 108,54 |
| 1 літоўскі літ | 1 277,12 | 1 украінская грыўня | 383,29 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 28,1456 |
| 10 UAH | 35,3100 |
| 10000 BYR | 92,3715 |
| EUR | 40,5268 |

## КПУП «Гомельоблреклама»

**филиал «Эксперт-Услуга» (организатор торгов)**
**извещает о проведении 25 апреля 2011 года**
**повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11-00 часов**
**в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-18**

| № лота | Предмет торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | МАЗ-54329-20ЕА1007–1994 г. | г. Гомель, пл. им. Ленина,1 | 16 800 000 | 1 600 000 |
| 2 | Полуприцеп ОДАЗ 9950 – 1990 г. | | 14 496 000 | 1 400 000 |

**Продавец:** Государственное учреждение «Гомельский областной драматический театр», контактный телефон: 74 41 22, пл. Ленина, 1, г. Гомель.
**Шаг аукциона - 5 %**. К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-18** в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 от даты опубликования настоящего извещения **по 22 апреля 2011 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (лоты №№ 1-2) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет организатора аукциона р/с 3012209370018, Филиал ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление код 912 УНН 400071204 ОКПО 02975763.**
Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 147 от 30.07.10.

**Контактные телефоны организатора аукциона:**
**8 (0232) 74 17 34, 74-89-64.**



**Считать недействительными страховые полисы**
## ЗАО «СК «Белросстрах»:

-добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 0805254, 0906141, 0918569, 0933679, 0855080, 0857873, 0863770, 0874301, 0874365, 0876023, 0959263, 0719061, 0789516, 0802911, 0804620, 0825772, 0853385, 0853551-0853554, 0860476, 0728963-0728965, 0813889, 0825146, 0844298, 0844306, 0844307, 0909228, 0932563, 0932915, 0932917, 0940276, 0940284, 0940286;
-квитанции 1 СУ серия КС №№ 0910766, 0910767, 0278822, 0283144, 0282782, 0284146, 0286225, 0292547, 0280429 и серия ГС № 5386472;
-добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско) 2РН, 2РП
серия АК №№ 0031962-0031963, №№ 0011693-0011694, 0028844;
-добровольное страхование строений; добровольное страхование домашнего имущества ф.2РН серия БИ №№ 0372361, 0372363, 0377016, 0380231;
-добровольное страхование от несчастных случаев ф.2РН, 2РП серия БИ № 0009147;
-страховой полис комбинированный «добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско); добровольное страхование от несчастных случаев» (форма 2РН, 2РП) серия БИ №0001460.



## КПУП «Гомельоблреклама»

**филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)**
**извещает о проведении 5 мая 2011 года**
**повторного открытого аукциона**
**по продаже имущества в 11-00 часов**
**в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Характеристика | Начальная цена продажи, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Воздушное судно НАРП-1 | Сельскохозяйственный, однодвигательный, поршневой двухместный моноплан. Изготовлен 01.09.2004, назначенный ресурс самолета 4 000 часов, 10 000 посадок, 15 лет. Ремонтов не имел. Двигатель Rotax -912, назначенный ресурс 3 600 часов, 45 лет. | 22 920 000 | 2 000 000 |

**Продавец**: Открытое акционерное общество «ГОМЕЛЬХИМСЕРВИС». Имущество расположено по адресу: 247050, г. Гомель, ул. Интернациональная, 25. **Шаг аукциона -5 %.** Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16 в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 от даты опубликования настоящего извещения по 2 мая 2011 г. включительно. Подача документов по почте не допускается.
Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца (Открытое акционерное общество «ГОМЕЛЬХИМСЕРВИС»): р/с 3012200630018, в Гомельском областном упр. ОАО «Бел.АПБ» УНП 400010620 ОКПО 05884280. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» №199 от 12.10.10. **Контактные телефоны организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64**


### НА ПАЖАРЫ ЗАГІНУЛІ МУЖ, ЖОНКА І СЫН

Каля паўночы 11 красавіка жыхары вёскі Лапатавічы Клімавіцкага раёна ўбачылі, як агнём палае суседняя хата, і выклікалі МНС. Выратавальнікі знайшлі тры целы без прыкметаў жыцця: 55-гадовага гаспадара хаты, яго 41-гадовай жонкі і іх 26-гадовага сына. Вось так адным разам на пажары загінула ўся сям'я.

**Ілона ІВАНОВА.**

# «БЫЛО АДЧУВАННЕ, ШТО Я Ў ПЕКЛЕ...»

**...Людзі пачалі прыносіць да прыступак на станцыю метро «Кастрычніцкая» кветкі і запаленыя свечкі ў той жа самы вечар — пасля трагедыі. Увесь ж мінулы дзень зранку да вечара да месца трагедыі зноў і зноў ішлі людзі. Па адным, па двое, купкамі... Яны неслі кветкі і запальвалі свечкі. Жанкі і дзяўчаты выціралі ад слёз вочы, мужчыны стаялі збольшага нерухома і напружана маўчалі. Шок. Жаль...**

Карэспандэнт «Звязды» распытаў людзей, якія прыйшлі да месца трагедыі, пра іх адчуванні і пачуцці ў гэтыя дні. Як высветлілася, многія на момант выбуху знаходзіліся зусім побач.

**Адам ГЛОБУС, пісьменнік:**

— У гэтым доме, на праспекце Незалежнасці, 23, знаходзіцца мая студыя, дзе я кожны дзень працую. Учора якраз у шэсць гадзін вечара я спускаўся са студыі ў метро. Сам выбух я не чуў, але ўбачыў жанчыну з чорным тварам і падумаў, што трэба ёй нешта сказаць. Але, калі азірнуўся, убачыў вакол сябе шмат такіх людзей — засыпаных зямлёй і попелам. У мяне было такое адчуванне, што я ў пекле знаходжуся. Усё адбывалася вельмі ціха і спакойна. Панікі не было. Такое адчуванне, што ты ўжо апынуўся ў пекле і таму ўжо не трэба мітусіцца, трэба дапамагчы тым людзям, хто ўжо ляжыць...

**Крысціна УСОВІЧ, студэнтка БДПУ імя М. Танка:**

— Мы прыйшлі з аднагрупнікамі ўшанаваць памяць загінулых. Для беларускага народа — для нас — гэта страшная трагедыя. Такога не было — гэта ўзрушыла ўсіх абсалютна. Мы вельмі моцна перажываем за тых людзей, у каго былі сваякі там. Гэта страшна.

**Людміла КРУГ, супрацоўніца магазіна:**

— Я тут працую недалёка — у магазіне «Андэграунд», у падземным пераходзе. Гэта якраз наш працоўны час. Калі была выбуховая хваля, у нашай краме задрыжала шкло. Мы выйшлі і ўбачылі, як людзі пачалі выбягаць чорныя. Заходзілі і да нас у магазін. Адна жанчына сказала, што згубіла там сумку. Увогуле — па яе твары было зразумела, нібыта яна развіталася з жыццём.

**Артур ТОРНЕР і Жэня СТАВЕР, навучэнцы:**

**Артур:**

— Майму сябру, можна сказаць, пашанцавала. Таму што ён у гэты час якраз мог ехаць на канцэрт, але яму не хапіла білета. Выпаў шчаслівы шанц застацца дома. Мы прыйшлі ўшанаваць памяць загінулых і выказаць спачуванні бацькам і родным тых, хто загінуў.

**Жэня:**

— Гэта страшная трагедыя для горада. Трэба караць гэтых уродаў, прабачце. Не пакідаць вось так.

**Тамара Фёдараўна, пенсіянерка:**

— Я хачу ўшанаваць памяць загінулых... Прабачце — мне цяжка гаварыць (удыхае — **аўт.**). І скажу: мы ўсё-такі адпомсцім за іх смерць, за ўсіх загінулых. Нас не спужаць — мы будзем яшчэ больш згуртаванымі, чым былі раней. Нас не запужаюць нічым. Будзем ушаноўваць памяць загінулых і рабіць усё, каб Мінск быў і далей прыгожым горадам. А злачынцаў, колькі будзем жыць, столькі будзем праклінаць. Я думаю, што наш праклён прымусіць іх задумацца. Няхай не радуюцца раней часу ад таго, што зрабілі...

**Студэнты Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва:**

— Было жаданне прыйсці і ўзгадаць ахвяр выбуху. Мы перажываем за народ. Людзі загінулі — гэта жудасна, раней такога не было.

З выкладчыкам замежнай мовы Вікторыяй Андрэевай я пагаварыў пазней. Дзяўчына ўзгадала падзеі мінулага дня з дакладнасцю да драбніц. У той час яна ехала па праспекце:

— Вялікае спачуванне пацярпелым. Учора я выехала на курсы, дзе выкладаю, значна раней — хацела правярыць масла ў машыне. Пад'ехала да выезду на праспект. Спачатку ўсё было як звычайна. Потым па сустрэчнай паласе вельмі хутка пачалі праносіцца машыны хуткай дапамогі і пажарныя. Я выехала на праспект, рух яшчэ не быў перакрыты. Праслухала ўсе каналы радыё — нічога не паведамлялі пра тое, што здарылася. Думалася, недзе штосьці загарэлася. Я ўжо даехала да ГУМа, і амаль што перада мной спынілі рух. Вадзіцелі пачалі нервавацца, з усіх бакоў сігналілі, праносіліся спецмашыны. Нарэшце па радыё аб'явілі, што на станцыі «Кастрычніцкая» адбыўся выбух. Вакол быў натоўп, параненых хутка — з мігалкамі — адвозілі. Людзі вельмі нерваваліся, ледзь не трапіла ў аварыю з удзелам шматлікіх машын. Калі выйшла з машыны, рукі і ногі трэсліся. Нават цяпер яшчэ не зусім адышла ад шоку. Якое, аднак, крохкае наша жыццё і дабрабыт... І як мы іх часта не цэнім...

**Ілья ЛАПАТО.**

Падрабязнасці

# Машыністы ратавалі пасажыраў

**У першыя мінуты пасля выбуху на станцыі метро «Кастрычніцкая» аднымі з першых на дапамогу пацярпелым прыйшлі машыністы Мінскага метрапалітэна. Сярод іх — Сяргей Плотнікаў. Наш карэспандэнт папрасіў яго расказаць аб тых трагічных падзеях у сталічнай падземцы.**

— Вечарам 11 красавіка я знаходзіўся ў пакоі рэзерву машыністаў. У нас такі парадак: на ўсялякі непрадбачаны выпадак прызначаецца рэзерв машыністаў на кожную змену.

Дык вось, прыкладна без пяці хвілін шэсць вечара мы пачулі адносна моцны, нязвыклы гук. Такое ўражанне, што быццам бы на скразняку моцна бразнулі дзверы. Ды так, што потым нябачная хваля ўдарыла па вушах. Я працую ў Мінскім метрапалітэне з першага дня яго адкрыцця і ніколі дагэтуль не чуў у пакоі рэзерву такіх гукаў. І такога з'едлівага і непрыемнага паху, які пранікаў да нас, таксама ніколі не было. Неяк трывожна стала на душы. Наш пакой знаходзіцца на станцыі «Купалаўская» — даволі далёка ад «Кастрычніцкай». Таму мы — група машыністаў — хутка пабеглі на станцыю.

Насустрач з боку пераходу ў клубах дыму рушылі людзі, яны закрывалі рот, чым маглі. Мы ўжо адчулі, што адбылося нешта экстраардынарнае, і наладзілі эвакуацыю людзей з метро. Пасля пабеглі да пераходу. Сустрэлі двух маладых хлопцаў 18-19-гадовага ўзросту. Яны рухаліся нібы кантужаныя, як у прастрацыі і паўтаралі гучна ў адчаі: «Дапамажыце хто-небудзь...» Відаць, яны пад уздзеяннем выбуху знаходзіліся ў стане шоку, страцілі арыентацыю і не ведалі, дзе выхад з метро. Скажу шчыра, выгляд іх быў жудасны: рукі апушчаныя і ў крыві, скура твараў і валасы апаленыя, пакрыццё іх куртак месцамі расплавілася. Я павёў гэтых небарак у наш фельчарскі пункт, каб ім аказалі першую медыцынскую дапамогу. Там пастаянна дзяжурыць фельчар.

Раптоўна званок у медпункт ад дзяжурнага па станцыі: «Нясіце тэрмінова жгуты». Я за іх — і пабег на «Купалаўскую». Жгуты спатрэбіліся для ратавання моцна параненага мужчыны сярэдніх гадоў. У яго былі перабітыя ногі, вялікая страта крыві. Мае калегі да прыезду «хуткай дапамогі» зрабілі ўсё магчымае, каб спыніць яе. Потым нашы машыністы прынеслі некалькі насілак. Мы на адных панеслі параненага наверх. Вярнуліся зноў. Вакол жах. Вось ляжыць мёртвы малады хлопец. Эскалатары ўжо не працавалі, вентыляцыя таксама. З'едлівы белы дым. Дыхаць не было чым. Там-сям траплялі на вочы фрагменты целаў. Напрыклад, адарваная нага — чамусьці без туфля і шкарпэткі. Але супрацоўнікі метрапалітэна разам з асобнымі пасажырамі, якія моцна не пацярпелі, працягвалі эвакуацыю. Вывелі чалавека без штаноў у трусах і моцна знявечаным тварам.

Я зноў пабег у наш медпункт паглядзець, як там тыя два хлопцы. Яны пасля ўколаў і таблетак выглядалі трохі лепш, былі здольныя самастойна рухацца і размаўляць. Наверсе ў той момант не аказалася машыны хуткай дапамогі, але пацярпелых пасадзілі ў сваю легкавушку незнаёмыя людзі і павезлі ў бліжэйшую бальніцу. Такое вось экстраннае дзяжурства выпала на лёс маіх таварышаў, якія ў той дзень дзяжурылі ў метро.

**Запісаў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# МІЛІЦЫЯ ЎЗМАЦНІЛА КАНТРОЛЬ У СТАЛІЦЫ

На ўсіх буйных аб'ектах Мінска з масавым знаходжаннем людзей праваахоўныя органы ўзмацнілі меры бяспекі, — перадае **БелТА** са спасылкай на Галоўнае ўпраўленне ўнутраных спраў Мінгарвыканкама. Прынамсі, паведамляецца, што ў ГУМе, ЦУМе, іншых гандлёвых цэнтрах, аўтавакзалах і прыпынках арганізавана дзяжурства аператыўных супрацоўнікаў, а станцыі мінскага метро Аўтазаводскай лініі знаходзяцца пад аховай супрацоўнікаў метро і палка спецыяльнага прызначэння.

Карэспандэнт «Звязды» вырашыў праверыць, наколькі сапраўды ў сталіцы ўзмоцнены меры бяспекі — для гэтых мэтаў быў наведаны ЦУМ. У прыватнасці, было заўважана пяць супрацоўнікаў міліцыі ў падземным пераходзе ад плошчы Якуба Коласа да філармоніі: тры з іх падымаліся наверх: відаць, патрулявалі прылеглыя тэрыторыі. Прычым два супрацоўнікі былі з курсанцкімі пагонамі.

Што тычыцца непасрэдна ЦУМа, то ў ім на розных паверхах было заўважана каля шасці супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Чаму каля, а не дакладная лічба? Таму што і я перамяшчаўся па ЦУМе, і патрулі міліцыі таксама не сядзелі на месцы — мог адных і тых жа палічыць па два разы або наадварот, некага не заўважыць. На ўваходах з двух бакоў супрацоўнікі міліцыі стаялі з невялікімі металашукальнікамі.

Калі казаць пра метро, то, па сведках відавочцаў, узмоцнены кантроль там сапраўды існуе. Прынамсі, раніцай на станцыі метро Каменная Горка на ўваходзе стаялі рамкі металашукальнікаў, усе пасажыры праходзілі праз іх, а супрацоўнікі міліцыі прасілі паказаць усе пакеты і сумкі, нават жаночыя. Аднак усё праходзіла хутка, дый пасажыры не абураліся, бо сітуацыя ўсім добра зразумелая.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# «ЯНЫ ЗАГІНУЛІ ЗА НАС»

За што ні бяруся пісаць, нічога не ідзе з-пад клавішаў. Трэба было б расказаць аб прэзентацыі кнігі Уладзіміра Счаснага «Мастакі парыжскай школы», якую ён правёў у мастацкім музеі Брэсцкай крэпасці, адкрыўшы для нас выхадца з Брэст-Літоўска Якава Балглея. Але гэта можна адкласці на пэўны час.

Пра ініцыятыву адміністрацыі Маскоўскага раёна Брэста па барацьбе з п'янствам таксама пакуль напісаць не атрымліваецца. Хоць нельга сказаць, што гэта зусім не па тэме: скончаных п'яніц і наркаманаў можна выкарыстаць у такіх антычалавечных справах, як тэракт. Ну, напрыклад, таму, хто, наставіўшы нож на прадаўца, забраў з паліцы бутэльку «чарніла», альбо наркаману падчас ломкі можна за дозу загадаць несці любы груз куды заўгодна.

Цяпер з кім ні гаворыш, тэма для абмеркавання ў людзей адна. І хоць у нас, на самым захадзе краіны, у Брэсце, ранкам было ўсё як заўсёды, на прыпынках тоўпіліся людзі, якія спяшаліся на працу, матулі вялі малых у садок, старэйшых праводзілі ў школу. Як заўсёды, толькі ў аўтобусе падалося, было непрывычна ціха, людзі размаўлялі цішэй, чым звычайна, ніхто не балбатаў па мабільніку.

На працы толькі адны размовы сярод суседзяў па паверсе: хто і калі дазваніўся да сваіх блізкіх, што жывуць, працуюць або вучацца ў Мінску. Мабільная сувязь, як вядома, пэўны час не працавала. Таму некаторыя нацярпеліся страху. Добра, што толькі страху...

Страх спачатку адчувалі і тыя, хто не дачакаўся сына ці дачкі, маці ці бацькі. Страх і надзею, пакуль не стала вядома імя. Кожны з нас мог бы аказацца на іх месцы. Як аказалася потым, нехта затрымаўся на працы, нехта, наадварот, пайшоў раней. Нехта толькі вярнуўся з камандзіроўкі, а іншы толькі збіраецца ехаць у сталіцу. Як трапна заўважыў адзін з журналістаў айчыннага телеканала, яны загінулі за нас.

Усе мы безабаронныя як перад землятрусамі і цунамі, так і перад тэрактамі. Хоць яшчэ дзень таму наша светаадчуванне было, здаецца, іншым. Калі ў другіх краінах рваліся самаробныя бомбы і гінулі людзі, мы амаль на ўзроўні падсвядомасці думалі: у нас гэта немагчыма, у нас так не будзе. Бо тыя краіны, дзе адбываюцца тэракты, фактычна знаходзяцца ў стане вайны з нейкімі сіламі, групоўкамі сіл. Мы ж ні з кім не ваюем. Але ж, аказалася, ваюем. І тым цяжэй, што праціўніка, які ўмела хаваецца, не ведаем. Ад гэтага яшчэ горш.

х х х

Пазваніла знаёмая і сказала, што ўчора яе першая думка была: як добра, што дачка паступіла не ў мінскі, а ў віцебскі медуніверсітэт. Потым, праўда, мы прыйшлі да высновы, што поўнасцю адчуваць сябе ў бяспецы ў сучасным свеце нельга, дзе б ты ні быў.

Раздаўся другі званок. Чытачка, ветэран працы Лідзія Яфімаўна Нарутовіч гаварыла і плакала. Адразу я падумала, што ў яе нехта аказаўся ў спісах. Але высветлілася, што ўнукі-мінчане, на шчасце, жывыя, здаровыя. Толькі жанчына не можа без слёз гаварыць пра іншых: «Я памятаю вайну, перажыла яе дзіцем, пасляваенны голад, разруху. Я думала, нашы дзецi будуць жыць у спакоі. Няхай іх пакарае Бог, тых нелюдзяў, што ўчынілі такое гора, аднялі дзяцей, родных у невінаватых людзей».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# Такога не павінна быць!

**Зараз, калі ты ўжо валодаеш пэўнай інфармацыяй, шмат што становіцца на свае месцы, робіцца больш зразумелым. Калі прайшоў першы шок. Калі табе пашчасціла. Калі ты папросту — жывы...**

Па гарачых слядах, вярнуўшыся пасля выбуху ў рэдакцыю, як мог, прадыктаваў усё, што на той момант змог выхапіць з уласнага мозгу, памяці. Напружваўся, разумеючы, што не ўсю інфармацыю яны аддаюць для паперы, але часам не мог сам, без староннняй дапамогі, прыгадаць элементарных рэчаў — назваў простых прадметаў, паняццяў. Менавіта прадыктаваў, бо пальцы рук напачатку па-здрадніцку дрыжэлі, а потым пачалі нямець. Толькі калі скончыў, памыў рукі, — заўважыў, якой чорнай была вада. Але гэта ўсё нікчэмнае...

Мне проста пашчасціла. Я зразумеў гэта толькі дома ўвечары, калі пачаў глядзець навіны па тэлебачанні... Калі пісаў у рэдакцыі, першая інфармацыя пра маштаб трагедыі толькі пачала з'яўляцца на стужках інфармагенцтваў, таму я проста апісваў тое, што сам бачыў, што чуў. Людзі чамусьці гаварылі пра падрыў пераходу, а гэта было не так.

Мне пашчасціла зайсці ў вагон у сярэдзіне саставу. Я так раблю заўсёды, але бываюць і выключэнні. Мне пашчасціла, на гэты раз яго не было. Мне пашчасціла пасля выбуху выйсці ў левы бок, да эскалатараў, што вядуць да Дома афіцэраў. Чаму туды, калі я ніколі не карыстаюся тым выхадам?.. Ды мне пашчасціла проста выйсці з вагона... Мне пашчасціла пайсці налева, таму я не бачыў усіх тых жахаў, якія рабіліся каля галавы саставу. Не бачыў скрываўленых людзей, тых разбурэнняў, бо ўсё там, з правага боку, было зацягнутае дымам і пылам. У мяне і адразу, і потым не адзін раз пыталіся, ці бачыў я трупы, узарваны вагон... Я ўвогуле ўяўлення не меў, што ўсё адбылося на платформе. Тады падалося, што гук выбуху быў нейкім працяглым. Напэўна, гэта эфект ад рэха ўдарнай хвалі? А пах паленага жалеза — гэта пах узрыўчаткі?

Мне пашчасціла, што ўдалося пагаварыць па тэлефоне з жонкай праз кароткі прамежак часу пасля выбуху, паведаміць, што жывы, спытаць, дзе знаходзіцца зараз брат — дома ці на працы... Мне пашчасціла, што маці даведалася пра ўсё і плакала ў слухаўку стацыянарнага тэлефона, калі я сам нават паспеў збольшага супакоіцца... Мне пашчасціла крыху пазней, калі маім лёсам пачала цікавіцца велізарная колькасць людзей: родных, калег па працы, суседзяў, чытачоў, з якімі калісь меў стасункі.

...Мой калега па цэху і таварыш сказаў мне па тэлефоне фразу, асэнсаваць да канца якую я няздольны і цяпер. Ён сказаў: я падумаў, усё прааналізаваў і прыйшоў да высновы — ты непазбежна павінен быў апынуцца там. Гэты выбух і ты — вы ішлі, як тыя караблі, насустрач адзін аднаму. Напэўна, каб потым напісаць пра тое, што здарылася? Я адказаў яму ўсё тым жа: мне пашчасціла. Я адмовіўся ад удзелу ў запісы тэлеперадачы, прысвечанай трагедыі, сказаўшы ўсё тыя ж словы. Ці ёсць мая заслуга ў тым, што мне пашчасціла?.. Ці ў тым, што быў адзіным журналістам, які ехаў у тым саставе?.. Гаварыць, калі яны самі таго захочуць, трэба найперш з тымі, хто прайшоў праз пекла, хто сапраўды змагаўся за сваё выратаванне і дапамагаў іншым. Я толькі магу дапоўніць іх словы тым нямногім, што бачыў, што засела ў памяці.

Панікі, як ужо пісаў, не было. Крыкі жаночыя былі, так, адразу пасля выбуху. Потым на тварах былі толькі разгубленасць, непаразуменне. Нават моцны страх на той момант быў больш унутры людзей. Туды, куды кінуўся да выхаду, працавалі эскалатары, здаецца, усе тры. На пад'ём. Пра падключэнне рэзервовага эскалатара, які звычайна прастойвае, было абвешчана вельмі хутка.

Не ведаю, ці варта пра тое гаварыць... Я магу казаць толькі за сябе. Ніколі дагэтуль не даводзілася бываць у такіх сітуацыях, што і адкуль мне дыктавала, не ведаю, але ў свядомасці чамусьці было чаканне другога выбуху... І калі быў на платформе... Думалася, што зараз якая-небудзь калона абрынецца. І пазней, калі разам з іншымі выйшаў на паверхню. Практычна ніхто нікуды адразу не пайшоў, усе як выйшлі, так у нейкім ступары і стаялі ці, тэлефануючы, кружлялі вакол аднаго месца. Я не быў выключэннем. І калі раз азірнуўся, мяне літаральна скаваў жывёльны жах: я стаяў каля металічнай сметніцы. Падумалася, што калі зараз нешта зноў у ёй ірване... Нервова адышоў і спыніўся каля... другой сметніцы. Пакуль знаходзіўся на тым месцы, яшчэ не было ні амапаўцаў, ні насілак, якія потым мільгалі ў тэлесюжэтах. Першая «хуткая дапамога» толькі развярнулася і да яе самі пачалі падыходзіць людзі — першыя недзе пяцёра... Было бачна праз дарогу — прама на прыступкі Палаца прафсаюзаў прысаджваюцца пацярпелыя, якія выйшлі праз той выхад. У гэты час на фасадзе Палаца Рэспублікі на велізарным экране рэкламаваўся канцэрт Шакіры. Вядомая спявачка бязгучна пела ў мікрафон і танчыла, запрашаючы на сустрэчу... Такая яркая пляма на фоне таго, што рабілася побач... На іншым экране на рагу Кастрычніцкай плошчы гэтак жа бязгучна нешта спрабаваў сказаць — што і каму? — беларускі вядучы выпуску навін...

...Памятаю і дагэтуль на фізічным узроўні адчуваю, як за апошнія сто метраў да рэдакцыі ногі раптоўна зрабіліся ватнымі... Памятаю і ўдзячны калегу, які «падкінуў» мяне да дому на машыне. Памятаю запоўненыя тралейбусы, уздоўж якіх мы праязджалі, што для паловы дзявятай гадзіны вечара не было характэрным... Памятаю сваё пытанне да жонкі: ці магу я лічыць 11 красавіка сваім другім днём народзінаў... Памятаю, як сон не браў да трох ночы, цыгарэты каля расчыненага балкона паліліся адна за другой, а гарэлка пілася як вада... Памятаю, як увесь гэты час я шаптаў сам сабе: такога не павінна быць, такога не павінна быць, такога не павінна быць...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАМЯЦІ АХВЯР ТРАГЕДЫІ Ў МІНСКУ 11 КРАСАВІКА

*Адзінаццаты дзень. Адзінаццаты год...*
*Выбух... Сэрца ад гора счарнела...*
*А у скронях пульсуе: «За што, мой народ,*
*На цябе подла ўзнята расмела*
*Сіла нелюдзя-звера?» І помста жыве —*
*І няхай будзе суд справядлівы!*
*Нашай веры ў сябе аніхто не ўзарве —*
*Не зрабіць наш народ палахлівым!*

**Дзмітрый ПЯТРОВІЧ.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**ООО «СИ-трейдинг» на строительство жилого дома № 6**
**(типовых потребительских качеств) по г/п в микрорайоне № 1**
**жилого района «Копище» в Минском районе**

**Информация о застройщике:**
Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг». Зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.
Место нахождения: 223053, Республика Беларусь, Минский район, район деревни Боровая 1, Главный корпус, каб. 439, телефон/факс 237 94 03.
Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 18.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00-14.00;
работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.
**Сведения о проектах строительства:**
